# Перспектыўным напрамкам эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і КНР з’яўляецца лагістыка



Перспектыўным напрамкам эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і КНР з’яўляецца лагістыка. Такі пункт гледжання выказаў у эксклюзіўным інтэрв’ю карэспандэнту БЕЛТА напярэдадні 25-годдзя ўстанаўлення беларуска-кітайскіх дыпламатычных адносін міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей.

“Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні важных гандлёвых шляхоў, якія звязваюць Балтыку з Чорным морам, а таксама Расію з Еўрапейскім саюзам. Мы актыўна развіваем участкі транскантынентальных транспартных калідораў, удасканальваем

лагістычную інфраструктуру на сваёй тэрыторыі”, — адзначыў кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства.

Ён лічыць, што гэта інфраструктура і транзітны патэнцыял могуць атрымаць значнае развіццё разам з ростам таварапатокаў Кітай-Еўропа па новым Шаўковым шляху.

Крыніца: www.belarus.by